УДК 94(476) «1941/45»

*П.С. Рамановіч*

# СТВАРЭННЕ І БАЯВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА ІМЯ Я.Г. МАКАРЭВІЧА (З УСПАМІНАЎ БАЙЦА АТРАДА Р.М. КАЛІЛЬЦА)

Адным з прыярытэтных накірункаў айчыннай і замежнай гістарычнай навукі з'яўляецца вывучэнне гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Для больш глыбокага асэнсавання падпольнай і партызанскай барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў асаблівую каштоўнасць уяўляюць успаміны непасрэдных удзельнікаў падзей мінулай вайны. У дадзеным артыкуле на аснове ўспамінаў байца партызанскага атрада Рыгора Мікітавіча Калільца паказана падпольная барацьба камсамольцаў і актывістаў в. Моталь, якія сталі стваральнікамі партызанскага атрада імя Я.Г. Макарэвіча і ўдзельнікамі яго баявых аперацый. Прыводзяцца прыклады падрыву партызанамі нямецкіх эшалонаў, паказваецца дзейнасць партызанскай камендатуры, узаемадзеянне беларускіх партызан з 1-й Украінскай партызанскай дывізіяй пад кіраўніцтвам П.П. Вяршыгары, мужнасць і гібель партызан у баях з ворагам.

## Уводзіны

У свядомасці цэлых нацый і народаў унікальнае месца займае гістарычная памяць пра Другую сусветную вайну, а для нашага народа – пра Вялікую Айчынную. Мінулая вайна – гэта не проста гераічная падзея сусветнай гісторыі XX ст. Другая сусветная вайна, у адрозненне ад войн лакальных, па прычыне сваёй маштабнасці прымушае зноў звярнуцца да той духоўнай спадчыны, якой гісторыя сустракала і праводзіла войны, спадзеючыся, што гэта ў апошні раз.

Другую сусветную вайну, а Вялікую Айчынную тым больш, нельга разглядаць як вайну, выкліканую супярэчнасцямі паміж заходнімі дзяржавамі, фашысцкай Германіяй і Савецкім Саюзам. Фашызм як практыка ёсць непазбежнае ўзвышэнне і перабольшванне «свайго» нацыянальнага (этнічнага) зместу, прыніжэнне носьбітаў іншых этнічных вартасцей, нават праз фізічную ліквідацыю.

Вывучэнне гісторыі Вялікай Айчыннай вайны было і застаецца адным з прыярытэтных накірункаў айчыннай і замежнай гістарычнай навукі. Па розных праблемах ваеннай гісторыі Беларусі апублікавана больш за 10 тыс. манаграфій, фундаментальных даследаванняў, артыкулаў, энцыклапедычных выданняў, успамінаў непасрэдных удзельнікаў падзей. Рэканструкцыя баявой дзейнасці асобных партызанскіх атрадаў вызначаецца неабходнасцю запаўнення прагалаў па дадзенай тэме, больш глыбокага асэнсавання падзей Вялікай Айчыннай вайны.

Беларусь была акупіравана на працягу чэрвеня–жніўня 1941 г. Фашысты ставілі за мэту ліквідаваць нацыянальную дзяржаўнасць Беларусі, ператварыць яе ў аграрнасыравінны прыдатак і калонію фашысцкай Германіі. Яны расчлянілі тэрыторыю Беларусі: паўночна-заходнія раёны Брэсцкай вобласці і Беластоцкую вобласць з гарадамі Гродна і Ваўкавыск далучылі да Усходняй Прусіі (бецырк Беласток), паўднёвыя раёны Брэсцкай, Пінскай, Палескай і Гомельскай абласцей – да рэйхскамісарыята «Украіна», утварыўшы з іх 4 акругі: Мазырскую, Васілевіцкую, Петрыкаўскую, Ельскую; паўночна-заходнія раёны Вілейскай вобласці ўключылі ў генеральную акругу Літва, Віцебскую, Магілёўскую, большую частку Гомельскай і ўсходнія раёны Мінскай абласцей – у зону армейскага тылу. У склад генеральнай акругі Беларусі («Генеральбецырк Беларутэнія») увайшлі Баранавіцкая, Вілейская, Мінская (без усходніх раёнаў), паўночныя раёны Брэсцкай, Пінскай і Палескай абласцей, што складала 1/3 тэрыторыі БССР. Гэтая тэрыторыя была ўключана ў склад рэйхскамісарыята «Остланд» з рэзідэнцыяй у Рызе і падзелена на 10 акруг (гебітаў): Баранавіцкую, Барысаўскую, Вілейскую, Ганцавіцкую, Глыбоцкую, Лідскую, Мінскую, Навагрудскую, Слонімскую, Слуцкую.

На чале генеральнага камісарыята Беларусі са жніўня 1941 г. быў гаўляйтар В. Кубэ (22.09.1943 г. знішчаны членамі мінскага падполля), яго замяніў начальнік СС і паліцыі на Беларусі групэнфюрар войск СС фон Готберг.

Акупацыйны рэжым, што быў устаноўлены нямецкімі войскамі на захопленай імі тэрыторыі, распрацоўваўся яшчэ да нападу на Савецкі Саюз. Галоўныя яго прынцыпы былі выкладзены Гітлерам у сакрэтным мемарандуме «Некаторыя думкі пра абыходжанне з насельніцтвам на Усходзе» ад 25.05.1940 г. У ім указвалася, што захопленыя ўсходнія тэрыторыі належыць разглядаць як аб'ект каланізацыі і германізацыі. Генеральны план «Ост» прадугледжваў не толькі германізацыю, а таксама высяленне і знішчэнне народаў Усходняй Еўропы, у тым ліку і Беларусі.

**Стварэнне і асобныя баявыя аперацыі партызанскага атрада імя Я.Г. Макарэвіча**

З самага пачатку акупацыі на беларускай зямлі пачаў разгортвацца партызанскі рух. Згодна з дырэктывай СНК і ЦК УКП(б) ад 29.061941 г. і пастановай ЦК УКП(б) ад 18.07.1941 г., арганізацыя партызанскай барацьбы была ўскладзена на партыйныя камітэты, органы НКУС СССР.

На разгортванне ўзброенай партызанскай барацьбы і падпольнай дзейнасці ў гарадах і іншых населеных пунктах Беларусі арыентавала Дырэктыва № 1 ЦК КП(б)Б ад 30 чэрвеня 1941 г. аб пераходзе на падпольную работу партарганізацый раёнаў, занятых ворагам, «у мэтах кіраўніцтва дзейнасцю партызанскіх атрадаў і дыверсійных груп у раёнах, занятых ворагам, для барацьбы з часцямі варожай арміі, для распальвання партызанскай барацьбы скрозь і ўсюды, для падрыву мастоў, дарог, псавання тэлеграфнай і тэлефоннай сувязі, падпалу складоў, для стварэння нязносных умоў для ворага і яго памагатых, для зрыву ўсіх яго мерапрыемстваў…» [1, с. 52].

1 ліпеня 1941 г. ЦК КП(б)Б прыняў Дырэктыву № 2 партыйным, савецкім і камсамольскім арганізацыям па разгортванні партызанскай барацьбы ў тыле ворага. Ставілася задача пакрыць усю занятую нямецка-фашысцкімі захопнікамі тэрыторыю Беларусі густой сеткай партызанскіх атрадаў [1, с. 53–54].

Ва ўмовах нянавісці да акупацыйнага рэжыму расло імкненне людзей да барацьбы з ім. Вайна супраць ворага аб'ядноўвала ўсіх – незалежна ад веры і нацыянальнасці. У канцы 1941 г. у розных рэгіёнах Беларусі незалежна адзін ад аднаго сталі ўзнікаць невялікія атрады і групы з мясцовых патрыётаў, партыйных і савецкіх работнікаў, актывістаў, ваеннаслужачых Чырвонай Арміі, якія апынуліся ў акружэнні. Фарміраванне атрадаў адбывалася ва ўмовах жорсткага дэфіцыту часу, без належнага матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння. З цягам часу гэтыя групы раслі, аб'ядноўваліся, ствараючы баявыя і даволі небяспечныя для ворага партызанскія фарміраванні.

Летам 1941 г. першымі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў выступілі І.М. Калілец (1920 г.н., сакратар гарпасялковага савета ў Моталі, сакратар камсамольскай арганізацыі), С.С. Мінюк (1914 г.н., участковы ўпаўнаважаны НКУС у Моталі), В.Г. Міронава (1916 г.н., па камсамольскай пуцёўцы ў 1939 г. была накіравана ў Заходнюю Беларусь наладжваць адукацыю, працавала дырэктарам школы ў Моталі).

***З успамінаў Р.М. Калільца[1]:*** «В августе–октябре 1941 г. Калилец Иван Михайлович открыто с оружием появлялся в Мотоле и окрестных деревнях. Вместе с С.С. Минюком, И.С. Парфеевцом из деревни Калилы и другими подпольщиками собирали оружие и готовились к открытой вооруженной борьбе. В сарае комсомольца А.К. Данилевича (д. Мотоль) провели собрание комсомольцев. Присутствовало около 30 человек. Было принято постановление: «К 24-й годовщине Великой Октябрьской социалистической революции срывать по возможности мероприятия немецко-фашистских оккупан-

[1] Успаміны Р.М. Калільца захоўваюцца ў асабістым архіве аўтара артыкула.

тов и выступить с открытыми боями». Вся деятельность подполья зимой 1941–1942 гг. свелась к агитационной работе среди населения против немецких оккупантов и мероприятий немецко-полицейского гарнизона по отправке в Германию продуктов, одежды, против выезда молодежи на работу в Германию. Люди убеждались в чуждой и враждебно-расовой идеологии немецко-фашистских захватчиков».

Да вясны 1942 г. падпольны і партызанскі рух праходзіў першы, арганізацыйны этап. Падпольныя арганізацыі і партызанскія групы былі малаколькаснымі і недастаткова ўзброенымі. Не існавала адзінага цэнтра, які б каардынаваў іх барацьбу. Удзельнікі савецкага руху супраціўлення не мелі асаблівай падтрымкі з боку мясцовага насельніцтва. Савецкая ўлада на тэрыторыі Іванаўскага і Драгічынскага раёнаў праіснавала толькі два гады, і за гэты час разам са станоўчымі зменамі назіраліся і негатыўныя з'явы – рэпрэсіі і дэпартацыі. Некаторая частка насельніцтва займала нейтральна-чакальную пазіцыю, частка – варожа ставілася да дзеянняў падпольшчыкаў і партызан.

У кастрычніку 1941 г. група падпольшчыкаў з вёсак Мотaля і Опаля ва ўрочышчы Мінічы (на поўнач ад в. Тышкавічы Іванаўскага раёна) залажыла першы партызанскі стан. У чэрвені 1942 г. адбылася сустрэча партызанскіх груп Іванаўскага і Драгічынскага раёнаў, якія паклалі пачатак стварэнню баявога атрада.

***З успамінаў Р.М. Калільца:*** «Часть группы, с Е. Макаревичем (лейтенант, командир пулеметного взвода, окруженец), стояла на том, чтобы идти на восток к действующей армии. Вторая часть группы, с Калильцом Иваном Михайловичем, настаивала на том, что нужно действовать на месте, начинать громить немецко-полицейские гарнизоны. Е. Макаревич с частью группы ушел на восток. На границе Телехановского и Ганцевичского районов встретился с рейдовой бригадой, в которой были представители БШПР. Е.Г. Макаревича назначили командиром отряда и приказали вернуться обратно в Споровские болота. Комиссаром отряда был назначен И.М. Калилец, начальником штаба – А.И. Семёнов. Молодого лейтенанта (Женьку) партизаны полюбили за его смелое и отважное спокойствие. В бою он вел себя хладнокровно и умело, команды были чёткие и ясные. Отряд под его командованием постепенно набирал силу, начал громить немецко-полицейские гарнизоны».

На тэрыторыі Беларусі адбывалася арганізацыйнае ўзаемадзеянне груп і атрадаў мясцовых партызан са спецгрупамі, якія накіроўваліся з тэрыторыі РСФСР. Магчымасці партызан значна ўзраслі, калі ў раён іх дзеянняў з Вялікай зямлі была дэсантавана спецыяльная група маёра В.А. Цвяткова, якая мела сувязь з БШПР. Задачай групы была арганізацыя партызанскага руху. Пры ўдзеле мясцовых партызан група правяла мабілізацыю мужчынскага насельніцтва з навакольных вёсак. Быў створаны партызанскі атрад № 25. У верасні 1942 г. адбылася сустрэча Я.Г. Макарэвіча і В.А. Цвяткова. Атрады пачалі супрацоўнічаць. Партызанскія атрады сталі папаўняцца новымі байцамі.

***З успамінаў Р.М. Калільца:*** «С быстрым ростом отряда в июне 1943 г. уже было создано две роты численностью более 100 человек партизан в каждой. В августе 1943 г. была выделена и третья рота. В ротах насчитывалось более 200 человек в каждой. Командиром 1-й роты был назначен Ф.Н. Лаврисюк, командиром 2-й роты – И.Н. Калилец, командиром 3-й роты – П.В. Товстелёв».

Лепшых партызан і камуністаў (па жаданні і па загадзе) забіраў у свой атрад В.А. Цвяткоў, папаўняючы свае спецыяльныя групы.

***З успамінаў Р.М. Калільца:*** «В июле 1943 г. Цветков забрал в отряд Юсупова Александра, Прадуна Александра, Мазько Куприяна, в том числе из Мотоля Шиколая Степана, Миховича Степана и Петра, Лукашевича Григория, Демковича Игната, Демковича Ивана, Типуна Василия и многих других».

У першы ваенны год атрад праводзіў эпізадычныя налёты на апорныя пункты ворага. З цягам часу засады, дыверсіі партызан на чыгунцы, баі з паліцэйскімі гарнізонамі ўсё больш і больш непакоілі акупантаў.

***З успамінаў Р.М. Калільца аб асобных баявых аперацыях партызанскага атрада імя Я.Г. Макарэвіча:***

«1) 20.10.1942 г. произведён взрыв на железной дороге Дрогичин – Снитово. Уничтожен паровоз и 50 вагонов, убито более 300 немцев;

2) 22.11.1942 г. произведён взрыв на железной дороге Иваново – Юхновичи, пущено под откос 8 вагонов с машинами;

3) 22.11.1942 г. сожжено 3 моста на узкоколейке Телеханы – Иваново. Сожжена станция в д. Поречье;

4) 14.01.1943. – бой в Мотоле. Напав на засаду полицаев, партизаны убили коменданта и четырёх полицаев;

5) 02.1943 г. – разгром Бездежского, Хомского, Брашевского, Левковичского постерунков;

6) 21.05.1943 г. – бой у д. Сороцни. Сожжена молотилка, уничтожена легковая машина, убито около 20 немцев;

7) 25.08.1943 г. – бой в Березлянах. Из партизанской засады было убито 3 и взято в плен 14 мадьяр;

8) 08.1943 г. – взрыв полотна Бродница – Иваново, Дрогичин – Нагорье, Дрогичин – Антополь. Бой у д. Гошево. Убит пулемётчик Миша и 6 партизан».

18 ліпеня 1943 г. ад куль украінскіх нацыяналістаў загінуў Я.Г. Макарэвіч.

***З успамінаў Р.М. Калільца:*** «Группа украинских националистов около 130 человек с большим запасом оружия направлялась в Западную Украину для борьбы с партизанами. Е. Макаревич с партизанами до 100 человек окружили националистов и после короткого боя предложили сдаться. На переговоры с националистами, которые выкинули белый флаг, пошли Е. Макаревич, Ф.Н. Лаврисюк (командир роты) и П.Ф. Минюк (командир отделения). Е. Макаревич отпустил часть партизан, а сам вместе с одним отделением повёл националистов в д. Кремко, чтобы там их разоружить. Увидев такую ситуацию, националисты автоматными очередями убили Е. Макаревича, ранили его адъютанта Васю Кузенко. Забрав планшет Е. Макаревича с шифровым кодом, националисты повернули к железной дороге Брест – Пинск. Далеко они не ушли. Все они были уничтожены партизанской бригадой Щорса на границе Белоруссии и Украины. После похорон Е. Макаревича (похоронен в д. Спорово) общее собрание партизан отряда постановило именовать отряд имени Е. Макаревича».

Брэсцкі падпольны абкам КП(б)Б і штаб злучэння партызанскіх атрадаў прызначылі камандзірам атрада Івана Міхайлавіча Калільца, які быў камісарам гэтага атрада. У атрадзе імя Я. Макарэвіча было некалькі спецыяльных груп, якія займаліся падрыўной справай. Асабліва эфектыўна дзейнічала група Мінюка Паўла Піліпавіча.

***З успамінаў Р.М. Калільца:*** «П.Ф. Минюк был сапером польской армии, знал подрывное дело и обучал партизан взрывать рельсы железной дороги. Сам изобрел мину «на карандаш». Это был самый эффективный, но опасный способ. Взрывчатка вкапывалась под рельсу, а на взрывчатку ставился взрыватель (запал). На запал торцом ставился сердечник из простого карандаша, и аккуратно вынималась чека. Под тяжестью паровоза карандаш ломался, и мина приводилась в действие. Этим способом подрыва эшелонов пользовались подрывники и других отрядов». Асабіста П.П. Мінюком і пры яго ўдзеле было падарвана 14 эшалонаў ворага.

З разгромам нямецкіх паліцэйскіх гарнізонаў партызаны ўзялі пад кантроль вялікую тэрыторыю ўздоўж чыгункі Жабінка – Кобрын – Лунінец – Баранавічы. У многіх населеных пунктах былі ўстаноўлены партызанскія камендатуры. У канцы 1943 г. па-

ліцэйскі гарнізон у Моталі быў разгромлены. Замест нямецкай у Моталі з’явілася партызанская камендатура (15 чалавек з ліку партызан атрада Я. Макарэвіча).

***З успамінаў Р.М. Калільца:*** «В д. Мотоль партизанская комендатура была создана в сентябре 1943 г. Комендантом был назначен бывший председатель поселкового совета Н.И. Калилец. Комендант имел печать с гербом БССР и надписью «Смерть фашистским оккупантам». Печатью удостоверялись пропуска, справки. Под руководством комендатуры была организована слесарно-токарная мастерская по ремонту и изготовлению оружия. В мастерской работали: мастера Я.М. Михович, А.А. Райкевич, токарем – И.Н. Райкевич, слесарями – Г.Н. Райкевич, Н.А. Стасевич, братья Алексей и Валентин Саевичи. В конце марта 1944 г. мастерская была перенесена в д. Тышковичи».

У канцы сакавіка 1944 г. у Іванава і Драгічын былі накіраваны рэгулярныя нямецкія часці і ўласаўцы з мэтай блакіраваць партызанскую зону і разграміць 1-ю Украінскую дывізію пад камандаваннем П.П. Вяршыгары. Асноўныя сілы партызан і каўпакаўцаў пачалі адыход, які забяспечвала рота атрада імя Я. Макарэвіча. З 28 сакавіка па 4 красавіка 1944 г. у раёне вёсак Калілы, Трыліскі, Моладава, Дастоева, Мотаь, Тышкавічы ішлі цяжкія баі.

***З успамінаў Р.М. Калільца:*** «Во второй половине марта 1944 г. в Мотоле расположилось соединение под командованием П.П. Вершигоры. Соединение находилось две недели. Было много раненых. Комендатура партизан и местное население оказывало помощь. Немцы с запада, юга и востока начали наступление на Мотоль. Оборонительные бои на подступах к Мотолю вела 2-я рота отряда Макаревича под командованием И.Н. Калильца. Бои продолжались 7 дней. Все соединения удачно отступили. Погибла пулемётная группа партизан из 5 человек, но враг временно был остановлен. Чтобы немцы не смогли преследовать ковпаковцев, через реку Ясельда был сожжён мост. В д. Тышковичи в бою с немецкими танками погибло 22 партизана».

Вораг быў часова спынены, што дало магчымасць выратавацца большай частцы насельніцтва. Партызаны з баямі адступілі ў Спораўскія балоты. Жорсткія баі ішлі каля вёскі Здзітава на рубяжы па рацэ Ясельда з карным атрадам СС і часцямі 5-й нямецкай дывізіі. Толькі праз два тыдні ворагу ўдалося фарсіраваць раку і выцесніць партызан у в. Спорава. Але ворагу не ўдалося прарвацца ў партызанскія лагеры. Тысячы мірных жыхароў былі выратаваны ад смерці. Партызанскія брыгады «Савецкая Беларусь» і імя Свярдлова ўтрымалі абарону да злучэння з Чырвонай Арміяй.

Немцы ўварваліся ў Моталь і ўчынілі жорсткую расправу над мірным насельніцтвам. Фашысты падпалілі вёску, забівалі ўсіх, хто трапіўся на вочы. Згарэла ўся заходняя частка вёскі.

***Даведка выканкама Іванаўскага райсавета дэпутатаў працоўных аб здзейсненых злачынствах нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў в. Моталь:*** «2 апреля 1944 г. при отступлении партизанского соединения Ковпака из Мотоля в направлении Ивацевичи – Телеханы немецкие захватчики ворвались в Мотоль и факелами подожгли жилые дома. В результате пожара сгорело 383 дома» [2, с. 168].

У ліпені 1944 г. атрад імя Я.Г. Макарэвіча налічваў 486 партызан. Атрад правёў 93 адкрытыя баі, у якіх знішчана каля паўтары тысячы фашыстаў, прыблізна столькі ж паранена [2, с. 187, 221].

**Заключэнне**

У сярэдзіне ліпеня 1944 г. часці 55-й гвардзейскай стралковай дывізіі пад камандаваннем Героя Савецкага Саюза генерал-маёра А.П. Турчынскага 20-га стралковага корпуса 28-й арміі вызвалілі в. Моталь. Саўінфармбюро паведаміла аб гэтым так: «На паўночным захадзе і захадзе ад г. Пінска нашы войскі, развіваючы наступленне, авалодалі

раённымі цэнтрамі Пінскай вобласці – гарадамі Янаў і Целяханы, а таксама з баямі ўзялі звыш 50 іншых населеных пунктаў, у тым ліку Тышкавічы, Моталь» [2, с. 242].

На могілках в. Моталь у брацкай магіле пахаваны савецкія воіны і партызаны. У 1955 г. там быў устаноўлены абеліск, а ў цэнтры Моталя – помнік 187 маталянам, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Я.Г. Макарэвіч пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені і медалём «Партызану Айчыннай вайны» II ступені. Імем адважнага камандзіра названа адна з вуліц г. Іванава.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944) : документы и материалы : в 3 т. – Минск : Беларусь, 1967. – Т. 1 : Зарождение и развитие партизанского движения в первый период войны (июнь 1941 – ноябрь 1942). – 744 с.
2. Памяць : гіст.-дакум. хроніка Іванаўскага раёна. – Мінск : БелТА. – 592 с.

***Romanovich P.S.*** **Formation and Military Activity of Guerrilla Group Named after E.G. Makarevich (on the Memories of a Fighter G.N. Kalilets)**

One of the priority directions of domestic and foreign historical science is the study of the history of World War II. For a deeper understanding of the underground and guerrilla struggle against the Nazis the memories of directly involved participants in the events are of great importance. In this article, based on the memoirs of Kalilets Gregory Nikitich, a fighter of the guerrilla group, the underground struggle of Komsomol members and activists of the village Motol, who became the creators and participants in military operations of the guerrilla group named after E.G. Makarevich is shown. The examples of undermining of German trains by partisans, the defeat of the German police garrisons, the activity of guerrilla commandant's office, the interaction of Belarusian partisans with the 1st Ukrainian Partisan Division under P.P. Vershigory, courage and death of partisans in combat with the enemy are given.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 22.02.2013